Приложение

ЗАЦВЕРДЖАНА

Загадам Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь

ад 16 ліпеня 1993 г. N 232

## ПРЫКЛАДНАЕ ПАЛАЖЭННЕ

### аб дзіцячым доме сямейнага тыпу

### I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дзіцячы дом сямейнага тыпу з'яўляецца адной з форм уладкавання ў сям'ю дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, мае статус дзяржаўнай установы адукацыі і карыстаецца правамі юрыдычнай асобы.

2. На дзіцячы дом ускладаюцца наступныя задачы:

- рэалізацыя права кожнага дзіцяці на пражыванне і выхаванне ў сям'і ў атмасферы любві, шчасця і ўзаемаразумення;
- ажыццяўленне грамадска-дзяржаўнай дапамогі дзецям-сіротам і дзецям, якія засталіся без апекі бацькоў, абарона іх правоў, стварэнне неабходных умоў для паўнацэннага развіцця, падрыхтоўкі да самастойнага жыцця і працоўнай дзейнасці;
- адраджэнне дабрачыннасці і міласэрнасці ў Рэспубліцы Беларусь у адносінах да дзяцей, якія апынуліся ў экстрэмальных сітуацыях і засталіся без сямейнага акружэння.

3. Дзіцячы дом можа быць у форме асобнай сям'і або уваходзіць у склад дзіцячай вёскі (гарадка).

Дзіцячы дом сямейнага тыпу - гэта сям'я, дзе на поўным дзяржаўным забеспячэнні выхоўваецца не менш за 5 дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў. Бацькі-выхавальнікі ў адносінах да дзяцей, якіх яны ўзялі на выхаванне, выконваюць функцыі апекуноў (папячыцеляў).

4. Агульная колькасць дзяцей у дзіцячым доме, як правіла, не можа перавышаць 10 чалавек з улікам родных дзяцей бацькоў-выхавальнікаў.



5. Дзіцячы дом сямейнага тыпу можа ствараецца сем'ямі жыхароў Рэспублікі Беларусь, у тым ліку і кроўнымі родзічамі дзяцей, акрамя бацькі і маці. Магчымы і варыянты стварэння дзіцячага дома адзінокімі жанчынамі, якія вырашылі прысвяціць сваё жыццё выхаванню дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў.

6. Рашэнне аб адкрыцці ці закрыцці дзіцячага дома ў выглядзе асобнай сям'і яго фінансава-матэрыяльным забеспячэнні, стварэнні неабходных умоў для выхавання дзяцей прымаецца выканкамам раённага, гарадскога, раённага ў горадзе Савета народных дэпутатаў па прадстаўленні аддзела адукацыі.

7. На падставе пастановы райгарвыканкама аб стварэнні дзіцячага дома сямейнага тыпу паміж бацькамі-выхавальнікамі і рай(гар)выканкамам (аблвыканкамам) заключаецца дагавор аб умовах выхавання і забеспячэння дзяцей у дзіцячым доме (дадатак 1). У выпадку парушэння ўмоў дагавора кожны з бакоў мае права звярнуцца ў суд.

Бацькам-выхавальнікам выдаецца пасведчанне ўстаноўленага ўзору (дадатак 2).

8. Дзіцячы дом кіруецца ў сваёй дзейнасці Законам "Аб правах дзіцяці", іншымі заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь і гэтым Палажэннем.

9. Дзіцячы дом знаходзіцца ў падпарадкаванні раённага, гарадскога, раённага ў горадзе аддзела адукацыі, які ажыццяўляе яго фінансава-матэрыяльнае забеспячэнне, аказвае метадычную дапамогу бацькам-выхавальнікам, кантралюе выкананне дзеючага заканадаўства Рэспублікі Беларусь у адносінах да яго выхаванцаў.

10. Органы аховы здароўя ствараюць спрыяльныя ўмовы медыцынскага абслугоўвання дзіцячых дамоў, арганізуюць не радзей аднаго разу ў год медыцынскі агляд, дапамагаюць бацькам-выхавальнікам у арганізацыі рацыянальнага харчавання, правядзенні аздараўленчых мерапрыемстваў і лячэбна-прафілактычнай работы.

11. Дзіцячы дом валодае самастойнасцю ў арганізацыі выхавання дзяцей.

12. Уладкаванне дзяцей у дзіцячы дом сямейнага тыпу не цягне за сабой узнікненне паміж бацькамі-выхавальнікамі і выхаванцамі аліментавых і спадчынных праваадносін, якія вынікаюць з шлюбна-сямейнага заканадаўства.

### II. КАНТЫНГЕНТ ДЗЯЦЕЙ, ІХ ПРАВАВОЕ СТАНОВІШЧА

13. Рашэнне аб накіраванні дзіцяці на выхаванне ў дзіцячы дом сямейнага тыпу выносіцца раённым, гарадскім, раённым у горадзе або абласным выканкамам Савета народных дэпутатаў па прадстаўленні аддзела адукацыі пры наяўнасці пісьмовай заявы бацькоў-выхавальнікаў.

14. У дзіцячы дом накіроўваюцца дзеці-сіроты і дзеці, якія засталіся без апекі